ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
6 07 2017 г.

*Вулічнае мастацтва*

# КАТЫ З БАЛОНЧЫКА,

## ці Аэразолем — па сцяне

**Некалькі гадоў таму ў сталіцы пачалі з'яўляцца незвычайныя малюнкі — сцены трансфарматарных будак і бетонныя агароджы «засялілі» выявы катоў у разнастайных вобразах. Так пачынаўся праект #Minskikot, за час якога вулічныя мастакі ўпрыгожылі мінскія двары больш як дзясяткам упадабаных гараджанамі герояў. Нядаўна арганізатары нанеслі месцы з малюнкамі на карту, стварыўшы такім чынам адмысловы маршрут для жыхароў сталіцы і гасцей горада. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» паназіралі за стварэннем чарговага «кацінага» стрыт-арта і пагутарылі з яго аўтарам пра развіццё гэтага вулічнага мастацтва ў Беларусі.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

На сцяне чарговай трансфарматарнай будкі ўжо практычна гатовая выява будучага «юбілейнага» ката — пятнаццатага ў праекце. Вусаты герой вышынёй прыкладна ў тры метры з'явіцца перад жыхарамі ў стылізаваным пад сярэднявечча строі з тэлефонам на сэлфі-палцы ў лапе — такі вось сучасны сюррэалізм. Малюе **мастак Дзмітрый КАШТАЛЬЯН** пад пякучым сонцам, абматаўшы вакол галавы футболку і стоячы на драбінах. Хлопец працуе тут ужо другі дзень, цалкам работу плануе скончыць за тры. Візуальна здаецца, што зроблена пераважная частка мурала (жывапісу на архітэктурных збудаваннях) — кот выкананы цалкам і ў колерах. Але гэта ілюзія, якраз цяпер час карпатлівай, але вельмі важнай працы: вулічны мастак прапрацоўвае дэталі, дадае дробныя штрыхі звычайным маленькім пэндзлем.

— Неяк я заўважыў у сецыве артыкул, у якім расказвалася аб праекце #Minskikot, — успамінае Дзмітрый. — Ён падаўся мне вельмі цікавым, захацеў сам паўдзельнічаць, звязаўся з арганізатарамі і прапанаваў ім свой эскіз. Такі вобраз ката склаўся сам па сабе. Сэлфі-палка — як сімвал часу, бо цяпер большасць людзей жыве са смартфонам у руцэ. А птушка, якая прысела на тэлефон, быццам бы кажа: «Азірніся наўкол, свет цікавейшы за карцінкі ў інтэрнэце». Таму гэта не зусім кот, а, хутчэй, чалавек. Увогуле, мне больш падабаецца маляваць жывёл, праз іх вобразы мне прасцей перадаваць свае думкі. Чаму такое адзенне ў героя? Ніякага падтэксту няма, проста імкнуўся зрабіць яго незвычайным.

Да вулічнага мастацтва хлопец прыйшоў праз хіп-хоп культуру ў пачатку 2000-х. Адразу зацікавіўся класічным шрыфтавым графіці, але пазней зразумеў, што яму больш даспадобы не простыя надпісы, а малюнкі з сюжэтам і героямі. Як гэта часта бывае, хобі стала працай — цяпер Дзмітрый стварае ілюстрацыі на заказ самых розных кампаній: рэкламных агенцтваў, часопісаў. Паводле яго слоў, найбольш часу ў вулічнага мастака займае работа дома, а не «ў полі» — эскіз, бывае, дапрацоўваецца працяглы перыяд часу, сам жа мурал ствараецца за некалькі дзён.

— На жаль, у Беларусі мала легальных праектаў, у якіх можна было б паўдзельнічаць вулічным мастакам, але гэта ўжо пытанне ініцыятывы. У Мінску дагэтуль няма месца, дзе можна было б законна маляваць графіці без папярэдняга зацвярджэння эскізаў адміністрацыяй горада, — мяркуе Дзмітрый. — Хацелася б пабачыць больш жадання ад саміх людзей, скажам, калі суседзі па доме збіраюць грошы і заказваюць у мастака які-небудзь малюнак на трансфарматарнай будцы, які будзе падымаць ім настрой штораніцы. Дзяржава ж проста не павінна перашкаджаць. Хаця, безумоўна, трэба ўлічваць меркаванні ўсіх зацікаўленых, каб не было гісторый, як з муралам «Чалавек без твару». Тады жыхары самі выступілі супраць вобраза, які падаўся ім негатыўным. Таму праект, у якім прымаю ўдзел, мне падаецца важным.

— Ідэя з'явілася ў нас у 2016 годзе як працяг іншай ініцыятывы пад назвай «Мартаўскія каты», у межах якой у сталічных дварах з'явіліся першыя малюнкі, — каментуе **каардынатар праекта Ганна ПАЗНЯК.** — Ідэя была простай: творча добраўпарадкаваць наш горад з дапамогай выяў катоў. Але мы хацелі рэалізаваць гэта ў больш шырокім маштабе: распрацавалі спецыяльныя стыкеры для месенджара Viber, узгаднілі новыя эскізы. Адміністрацыі Партызанскага раёна і РУП «Мінскэнерга» праект спадабаўся, яны пайшлі нам насустрач і зацвердзілі шэсць новых пляцовак.

Арганізатары #Minskikot дапускаюць, што новыя каты будуць з'яўляцца ў сталіцы і надалей. Ужо цяпер паблік-чат у месенджары Viber створаны для камунікацыі ўдзельнікаў, налічвае 330 тысяч падпісчыкаў і з'яўляецца адным з лідараў па гэтым паказчыку ў Беларусі. Многія гараджане просяць, каб праект працягнуўся і ў іншых раёнах сталіцы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

### З кароткай гісторыі

Легальны стрыт-арт у Беларусі развіваецца адносна нядаўна. Калі ў нашых суседзяў з Польшчы ці Літвы муралы на сценах будынкаў пачалі ствараць яшчэ ў канцы 1990-х, то ў Мінску першыя маштабныя малюнкі з'явіліся толькі пару гадоў таму. Гэта адбылося ў першую чаргу дзякуючы двум вялікім праектам: Urban Myths і Vulica Brasil. У межах першага ў сталіцу прыязджалі вядомыя мастакі з усяго свету, якія пакідалі свае работы ў розных пунктах горада. Сярод самых вядомых можна згадаць таго самага «Чалавека без твару» аўтарства грэка Ino (вуліца Варанянскага), «Дзяўчыну ў вышыванцы» брытанца Гвіда ван Хэлтана ці «Ярылу» іспанца DEIH (абодва на інтэрнатах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў). Другі фестываль — вынік сумеснай творчасці беларускіх і бразільскіх аўтараў, іх працы сканцэнтраваны пераважна ў раёне вуліцы Кастрычніцкай. Твар славутага Караля Чапскага, «Гусляр» і многія іншыя муралы зрабілі былы індустрыяльны раён пунктам прыцягнення турыстаў.

Нягледзячы на першапачатковы скепсіс большасці мінчан, малюнкі прыйшліся даспадобы, таму ў апошні час такіх ініцыятыў з'яўляецца больш. Так, напрыклад, грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» штогод змяшчае выявы «птушак года» на жылых дамах у сталіцы (напрыклад, сёлета гэта будзе жаўрук-смяцюх), а адміністрацыя Фрунзенскага раёна аб'явіла конкурс эскізаў будучага мурала, які з'явіцца ў Тучынскім скверы.

*Адваротны бок медаля*

# ЗА ГРАННЮ ВАНДАЛІЗМУ

## Для некаторых начныя графіці — «спорт»...

**Графіці, мабыць, адзін з самых неадназначных відаў творчасці. Усё з-за таго, што малюнкі часта з'яўляюцца не там, дзе іх, магчыма, хацелі б бачыць людзі і дзе дазволена іх пакідаць, а на паверхнях, якія выбірае сам аўтар: на новых прыпынках, сценах, грамадскім транспарце. Каб даведацца, дзе ляжыць мяжа паміж мастацтвам і вандалізмам, і як карае закон за малюнкі ў непрадугледжаных месцах, я звярнулася да «начнога» графіцыста Мікалая. Імя суразмоўніка зменена, і растлумачыць гэта проста: хлопцы з асцярожнасцю ставяцца да празмернай цікавасці.**

***— Наколькі ведаю, ты малюеш не толькі ў Беларусі... І чым жа цябе так прываблівае «начное мастацтва»?***

— Сапраўды, я малявау ў Расіі, Украіне, Балгарыі. Дзе падарожнічаю, там і пакідаю такі адмысловы след. Я скончыў мастацкую школу, інстытут, але мне падабаецца займацца найперш маляваннем па начах.

Графіці не абмяжоўваецца ніякімі законамі. Яно існуе насуперак, яно вольнае. Ты не абмежаваны ў памерах. Тваё палатно — горад, транспарт — усё, што хочаш. Яно нелегальнае, а значыць, ёсць у ім нейкі адрэналін. Графіці — гэта наркотык. Напрыклад, мой знаёмы займаецца гэтым досыць доўга.

***— З чаго ўсё пачынаецца?***

— Спачатку выбіраеш месца. Вызначаешся з колерам. Купляеш фарбы і прыдумляеш, якія «фішкі» будуць у графіці. Рыхтуеш скетч-малюнак. Прадугледжваеш шляхі адыходу. Бярэш аднаго або двух чалавек (у залежнасці ад месца), якія будуць стаяць, глядзець, што ды як. Ну, а ты на месцы накідваеш скетч-малюнак, фарбуеш, абводзіш.

***— У звычайным мастацтве ёсць кірункі, стылі. А ў графіці?***

— Існуе некалькі напрамкаў. Напрыклад, тэгі — гэта шрыфтавыя надпісы. З іх пачыналася графіці. Флопы — гэта акруглыя літары, хуткія малюнкі. Як тэгі, толькі аб'ёмныя. Яшчэ ёсць трэйн-бомбінг. Гэта па цягніках. Стрыт-артам называюцца малюнкі на дамах ці іншых будынках. Я не люблю стрыт-арт. Ён часта бывае па згодзе з уладамі. За яго графіцыст можа нават грошы атрымаць. Па сутнасці атрымліваецца, што ён прадае сваё мастацтва. А графіці нарадзілася нелегальным, і платы за яго ніхто не атрымліваў.

***— І якія ў вас у сувязі з гэтым стасункі з міліцыяй? І дзе ты бачыш мяжу паміж вандалізмам і мастацтвам? З якімі водгукамі часцей сутыкаецеся?***

— Здаралася, што бегалі. А калі не ўдавалася, міліцыянеры складалі на нас пратакол. Аднойчы сам выдаляў свой жа графічны надпіс.



Узор сучаснага стрыт-арту.

Вандалізм — гэта калі ламаюць, знішчаюць. Напрыклад, б'юць шыбы, рэжуць сядзенні, ламаюць прыпынкі. У гэтым няма ідэі. Калі ж казаць пра графіці, яно ў жаданні пакінуць след, пакінуць аўтограф, намаляваць у недаступным месцы.

Большасць усё ж такі супраць графіці. Калі каму і падабаюцца малюнкі, то шрыфт надпісаў ацэньвае яшчэ менш людзей. Шкада, канешне, што нашу творчасць змываюць, зафарбоўваюць. Але гэта для нас як спорт: затое зрабіў.

...З аднаго боку, графіці — гэта мастацтва і, безумоўна, яно заслугоўвае павагі і цікаўнасці з боку грамадства. З іншага боку, ёсць заканадаўства, якое вельмі строга ставіцца да такога «віду творчасці». Так, графіцыстаў-нелегалаў могуць абвінаваціць па артыкуле 218 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці», артыкуле 17.1 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях Рэспублікі Беларусь «Дробнае хуліганства» і г. д. Усяго налічваецца пяць артыкулаў у двух кодэксах, якія прадугледжваюць магчымыя пакаранні для графіцыстаў. І пра гэта ўвесь час трэба памятаць.

**Наталля ТЫЧКО,**
**студэнтка II курса**
**Інстытута журналістыкі**
**БДУ.**

*На карысць справе*

# «ЗАЧАПІЦЬ» ПОГЛЯД МІНАКА

## І прымусіць задумацца пра бяспеку

**У Мінскім раёне на жылых дамах з'явіліся графіці, якія нагадваюць аб правілах бяспекі.**




У населеных пунктах Гатава і Лясны на фасадах дамоў можна пабачыць незвычайныя яркія малюнкі на сценах, якія адлюстроўваюць мужнасць і гераізм ратавальнікаў і нагадваюць пра важнасць захавання правілаў пажарнай бяспекі.

Для прыцягнення ўвагі грамадскасці да праблемы гібелі людзей на пажарах ратавальнікі пры дапамозе сацыяльнай рэкламы звяртаюцца да розных метадаў уздзеяння і шукаюць новыя формы. Адной з іх і стала нанясенне графіці супрацьпажарнай накіраванасці на будынкі і збудаванні.

Ратавальнікі ўпэўненыя, што такія малюнкі будуць не толькі радаваць погляд мінакоў і ўпрыгожваць раён, але і стануць падставай задумацца пра бяспеку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*